З фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі




# Шэдэўры беларускай архітэктуры ў малюнках Напалеона Орды

**Шэдэўры беларускай літаратуры ў малюнках Напалеона Орды / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. – Минск : РАЙ, 1997. – 12 с.**

Радзіма выдатнага беларускага мастака, кампазітара, грамадскага дзеяча Напалеона Орды (1807-1883) – маёнтак Варацэвічы на Палессі (Іванаўскі раён Брэсцкай вобласці).

Патомак двух вядомых шляхецкіх родаў – Ордаў і Бутрымовічаў, гімназіст славутай Свіслацкай гімназіі, студэнт Віленскага ўніверсітэта, удзельнік тайных студэнцкіх аб’яднанняў і паўстання 1830-1831 гг. Эмігрант, сябар А. Міцкевіча, Ф. Ліста, Ф. Шапэна. У 40-я гады XIX ст. дырэктар Італьянскай оперы ў Парыжы. Пасля 25 год эміграцыі ў 1856 вярнуўся на Радзіму. Амаль 20 год нястомна падарожнічаў па Беларусі, Украіне, Літве, Польшчы і маляваў. За 1873-1883 выйшла 8 серый “Альбомаў” яго твораў.